# Да пытання аб суадносінах тэрмінаў «гродскі» і «замкавы» суд

*Валадковіч В. А., студ. V к. БДУ,*
*навук. кір. Любы А. У.,*
*канд. гіст. навук, дац.*

Сярод судовых устаноў Вялікага княства Літоўскага значнае месца займаў гродскі суд. Большасць даследчыкаў называе гродскі суд замкавым і лічыць гэтыя два тэрміны сінонімамі [1, с. 63; 2, с. 117; 3, с. 34]. Вядомы даследчык І. Лапо таксама атаясамлівае гэтыя тыпы судоў, выкарыстоўваючы тэрмін «замкава-гродскі суд» [4, с. 55]. Толькі А. Грыцкевіч і Ю. Доўнар падзяляюць замкавы і гродскі суды як асобныя тыпы судовых устаноў [5, с. 171; 6, с. 25].

Пры разглядзе крыніц узнікае пытанне аб правамернасці суадносін гэтых паняццяў. Тэрмін «замкавы суд» з канца XVI ст. ужываецца ў дачыненні да прыватнаўласніцкіх гарадоў [7, с. 102]. Гэта бачна на прыкладзе Слуцка, які згадваецца ў прывілеі Казіміра 1441 г. як прыватнаўласніцкі горад, што належаў князю Алельку Уладзіміравічу [8, с. 9]. Магнаты самі або з дапамогай розных службовых асоб кіравалі горадам, выконвалі судовыя функцыі. Як адзначае А. Грыцкевіч, з XVI ст. па XVIII ст. ва ўсіх буйных прыватных гарадах існавалі замкавыя суды [5, с. 175]. Пасяджэнні праводзіліся ў замку, адкуль і пайшла назва. Напрыклад, на тэрыторыі Слуцкага княства ўся судовая арганізацыя была падпарадкавана слуцкаму князю. З сярэдзіны XVI ст. ён надзяляў судовай уладай свайго намесніка, які "чинил суд" у княжацкім замку [5, с. 170]. Па сваёй кампетэнцыі гэты суд быў роўны дзяржаўным — гродскаму і земскаму судам, разам узятым [5, с. 171]. Ён разглядаў грамадзянскія і крымінальныя справы шляхты, мясцовых зямян, баяр. У яго падсуднасць уваходзілі таксама крымінальныя і важнейшыя грамадзянскія справы слуцкіх мяшчан, яўрэяў і іншых падданых слуцкага князя. Апеляцыі на рашэнні гэтага суда падаваліся ці самому слуцкаму князю, ці яго генеральнаму эканому. Акрамя таго, суд рэгістраваў буйныя гандлёвыя здзелкі, у тым ліку продаж домаўладанняў, зямельных надзелаў, сведчыў у натарыяльным парадку завяшчанні і інш. Такія ж замкавыя суды існавалі і ў іншых прыватнаўласніцкіх гарадах, дзе замкавы суд быў альтэрнатывай гродскаму суду. У адносінах да такіх гарадоў у крыніцах часцей за ўсё выкарыстоўваецца тэрмін «пришедши на врадъ до замку» [9, с. 14].

Паралельна з замкавымі судамі ў Вялікім княстве Літоўскім дзейнічалі гродскія суды. Гэты суд згадваецца ў крыніцах як «врад кгродскі», «на рочкахъ судовыхъ кгродскихъ», «na urzędzie grodzkim» [9, с. 32; 10, с. 202; 11, с. 195]. Галоўная роля ў іх належала службовым асобам мясцовай адміністрацыі: ваяводзе, старасце, дзяржаўцу. Гродскі суд з'яўляўся агульнасаслоўным. Ён разглядаў як крымінальныя (аб разбоях, забойствах, падпальваннях, крадзяжах, чараўніцтве), так і некаторыя грамадзянскія

справы (невыкананне дагавору заема, арэнды). Прычым ўсе пералічаныя катэгорыі іх разглядаліся дадзеным судом толькі ў тых выпадках, калі злачынца быў затрыманы на месцы ці злоўлены на працягу 24 гадзін пасля ажыццяўлення злачынства ці (калі адсутнічаў факт затрымання вінаватага) калі заява была перададзена ў суд не пазней тыдня пасля здзяйснення злачынства. З другой паловы XVI ст. часам сустракаецца выраз «на враде его королевское милости, в замку», аднак гэта сведчыць толькі пра месца пасяджэння гродскага суда пэўнага павета і не дае падставы атаясамліваць гродскі і замкавы суды як сінонімы [9, с. 304].

Такім чынам, неабходна падзяляць гродскі і замкавы суды як асобныя ўстановы. Замкавыя суды былі характэрныя для прыватных уладанняў, а гродскія — для дзяржаўных, аднак гэтыя два тыпа судоў існавалі паралельна, мелі прыкладна аднолькавыя функцыі і склад, асабліва да рэформы 1564–1566 гг., таму часта гэтыя суды аб’ядноўваюць у адзін тып.

## Літаратура


1. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. / А. Ф. Вішнеўскі, І. У. Вішнеўская. — Мінск: Тетра-Системс, 2005. — 192 с.

2. Юхо, Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. — Мінск: Універсітэцкае, 1992. — 270 с.

3. Кутас, Р. А. Гродский суд в Великом княжестве Литовском // Гуманітарна-эканамічны веснік. — 2003. — № 2.

4. Лаппо, И. Гродский суд в Великом княжестве Литовском в XVI столетии // Журнал мин-ва нар. просвещения. — 1908. — № 1. — 113 с.

5. Грицкевич, А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв.: соц.-экон. исслед. истории городов / АН БССР, Ин-т истории. — Минск: Наука и техника, 1975. — 248 с.

6. Доўнар, Ю. П Судовая рэформа XVI стагоддзя ў Вялікім Княстве Літоўскім / Ю. П. Доўнар. — Мінск: Беларускі дзяржаўны універсітэт, 2007. — 173, [2] с.

7. Описание документов архива западнорусских униатских митрополитов. Т. 1: 1470–1700, 1897. — 502, [1] с., [4] л. факсим.

8. Собрание древних грамот и актов городов: Вильны, Ковна, Трок, православных монастырей, церквей и по разным предметам: с прил. трех литограф. рис.: [в 2 ч.]. — Вильна: Тип. А. Марциновского, 1843.

9. Акты, издаваемые Комиссией, высочайше учрежденной для разбора древних актов в Вильне: [в 39 т.]. — Т. 3: Акты Брестского гродского суда: [1401–1699 гг.], 1870. — 416 с.

10. Акты, издаваемые Комиссией, высочайше учрежденной для разбора древних актов в Вильне: [в 39 т.]. Т. 36: Акты Минского гродского суда, 1582–1590 гг. (Виленского центрального архива № 11765) / предисловие И. Я. Спрогиса, 1912. — 452 с.

11. Акты, издаваемые Комиссией, высочайше учрежденной для разбора древних актов в Вильне: [в 39 т.]. Т. 7: Акты Гродненского гродского суда: [1510–1784 гг.] / предисловие Н. И. Горбачевского, 1874. — 614 с.